**2026 г. – 45 гадоў з часу заснавання саўгаса «Днепра-Бугскі» (Кобрынскі р-н; 1981), з 2004 г. – ААТ «Днепра-Бугскае»**



Саўгас «Днепра-Бугскі» Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці быў створаны на меліяраваных землях 17 лютага 1981 г. Сваім нараджэннем саўгас абавязаны спецыялістам і рабочым ПМК-52 і ПМК-57. Агульная зямельная плошча гаспадаркі складала 8086 га, з якіх 5533 – меліяраваныя.

Пабудавана 138 км дарог, у тым ліку 13 – заасфальтавана, 200 км асушальных каналаў, штучнае возера, люстэрка вады якога складала 146 га. 1183 га асушана закрытай дарожнай сеткай, 382 – арашалася пры дапамозе дажджавальных установак. На меліяраваных землях была створана асушальна-увільготненая сістэма, якая дазваляла ў вегетацыйны перыяд падтрымліваць аптымальны ўзровень грунтовых вод для нармальнага развіцця культывіруемых раслін.

Саўгас «Днепра-Бугскі» спецыялізаваўся на вырошчванні ў год каля 2,7 тыс. кароў першым целем, каб потым забяспечваць імі дойны статак раёна. Закуплялі ў іншых гаспадарках цялушак, вырошчвалі іх, а потым прадавалі для ўвядзення ў дойны статак. Таксама саўгас займаўся вытворчасцю насення шматгадовых траў, збожжа, бульбы і малака на комплексе, дзе ўтрымліваліся 800 кароў.

Шаснаццаць гадоў (люты 1981 г. – люты 1997 г.) саўгас узначальваў Антон Сцяпанавіч Ткачук (1945–2015). Яму былі ўласцівы высокі прафесіяналізм, кампетэнтнасць і адказнасць на даручаную справу. На новым месцы А. С. Ткачуку ўсё даводзілася пачынаць з нуля: падбіраць спецыялістаў, ствараць новы калектыў, арганізоўваць вытворчасць.

Ужо ў 1986 г. саўгас дасцягнуў праектных паказчыкаў. З аднаго гектара было атрымана па 51 ц збожжа, 360 ц бульбы. Выхад кармавых культур склаў 55 ц кармавых адзінак з аднаго гектара сельгасугодзій, супраць 40 па праекту. Удой малака ад адной коровы ў год атрыманы 4026 л замест 4000, намечаных праектам. Штогод загатоўвалася каля 25 тыс. т сенажа і сіласа, болей 3 тыс. т сена і іншых відаў кармоў. Рэнтабельнасць гаспадаркі дасягнула узроўня 50–70 працэнтоў.

У 1988 г. саўгас набыў 420 галоў плямістых аленей, рогі якіх з'яўляюцца цэннай сыравінай для фармацэўтычнай прамысловасці. Да 1995 г. іх статак узрос да 1000 галоў. Была арганізавана свая аленеферма – першая ў Беларусі.

За першае дзесяцігоддзе свайго існавання саўгас ператварыўся ў высокарэнтабельнае, магутнае сельскагаспадарчае прадпрыемства са стабільнай эканомікай і вялікімі грашовымі прыбыткамі. Гаспадарка не толькі грымела сваімі поспехамі на ўсю Беларусь, але і была вядома далёка за яе межамі. Убачыць пас. Арэхаўскі (заснаваны ў 1980 г.), які вырас сярод балот на меліяраваных землях, прыязджалі дэлегацыі з усяго былога Савецкага Саюза.

Старанная праца А. С. Ткачука была адзначана ўзнагародамі: двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976, 1986), медалём «За доблестный труд» (1986), шэрагам ганаровых грамат. У розныя гады гаспадаркай кіравалі: Аляксандр Сцяпанавіч Сахарчук (1997–2005), Уладзімір Лявонцьявіч Саўчук (2005–2020), Іван Дзям'янавіч Хамляк (2020–2022). З 2002 г. – Арцемій Камалуцінавіч Шчамхалаў.

З 30 чэрвеня 2001 г. па 13 снежня 2004 г. гаспадарка функцыянавала як камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства (КСУП). Затым пераўтворана ў ААТ «Днепра-Бугскае». Асноўныя віды дзейнасці: вытворчасць і рэалізацыя малака, ялавічыны, вырошчванне аленей, развіццё раслінаводства.

На сённяшні дзень агульная зямельная плошча гаспадаркі – 5122 га, у тым ліку 1402 га раллі, 2718 га сенакосоў, 200 га сажалак і вадаёмаў. У гаспадарцы маецца жывёлагадоўчы комплекс. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы на 1.01.2026 г. склала 2757 галоў. Вытворчасць малака за 2025 г. склала 8755 т. Удой малака на карову – 7188 кг у год. Рэалізавана 474 т мяса. Маецца аленеферма на 160 галоў. Ураджайнасць збожжавых культур складае 42,6 ц/га. Колькасць працуючых на 1.01.2026 г. – 171 чалавек.

Разам з эканамічнымі пытаннямі паспяхова вырашаецца і сацыяльны складнік аг. Арэхаўскі Дзівінскага сельсавета. Цэнтр гаспадаркі – сучасны пасёлак (з 2016 г. аграгарадок) з 3- і 4-павярховымі дамамі, катэджамі сядзібнага тыпу. Знаходзіцца за 42 км ад райцэнтра. Сёння тут пражываюць 747 чалавек. Функцыянуюць сацыяльныя аб'екты: сярэдняя школа, дзіцячы сад, праваслаўны храм (2005), сельскі Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, сталовая, лазня, магазіны.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2026 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Галавейка Таццяна Аляксееўна, загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі


1. **Савчук, В. Л.** «Днепро-Бугское» / В. Л. Савчук // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Минск, 2009. Т. 1, кн. 1. С. 328–329.
2. **Агрогородок «Ореховский»** // Агрогородки Брестчины. РИА «Вечерний Брест», 2010. С. 160.
3. **Арэхаўскі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. Мінск, 2006. Т. 4. С. 118.
4. **Лукашик, П. И.** Прошлое и настоящее / Петр Иосифович Лукашик. – Брест : Брестская типография, 2002. – 48 с. – См. на с. 29–30.
5. **Борушко, В.** Белоруссия: люди, события, факты / В. Борушко. – Минск : Беларусь, 1988. – См.: Совхоз «Днепро-Бугский». С. 136.
6. **Ткачук Антон Сцяпанавіч** // Па працы – пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. Кобрын, 2020. С. 77–78.

7. **80 гадоў з дня нараджэння А. С. Ткачука** (1945–2015) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. Кобрын, 2020. С. 183.
8. **Ардэнаносцы** : Ткачук Антон Сцяпанавіч // Па працы – пашана : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. Кобрын, 2020. С. 77–78.
9. **Ткачук, А.** По пути специализации / А. Ткачук // АПК: курсом ускорения. Минск, 1988. С. 85–86.
10. **Бакун, Е.** Соль земли – аграрии : [семья Дейнека из ОАО «Днепро-Бугское»] / Елена Бакун] // Кобрынскі веснік. 2026. 23 мая (№ 21). С. 12.
11. **Белов, Д.** Любовь к родной земле – от деда к внукам : [в ОАО «Днепро-Бугское» состоялось чествование трудовой династии Ивана, Алексея, Владислава и Татьяны Радкович] / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. 2025. 7 чэрвеня (№ 23). С. 6.
12. **Андросова, О.** Все для человека труда : [в рамках республиканской акции «Наш животновод» Кобринская районная организация профсоюза работников АПК наградила лучших животноводов ОАО «Днепро-Бугское»] / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. 2025. 1 лютага (№ 5). С. 6.
13. **Елизарова, Ж.** Отпуск за штурвалом комбайна : [о водителе ПАСЧ № 3 Кобринского РОЧС Артуре Якимуке, который второй сезон работает на уборке зерновых в ОАО «Днепро-Бугское»] / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. 2025. 23 жніўня (№ 34). С. 12 : фот.
14. **Андросова, О.** На рабочем месте поддержал коллектив : [о бухгалтере ОАО «Днепро-Бугское» Ангелине Сухаревич] / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. 2025. 11 студзеня (№ 2). С. 15.
15. **Андросова, О.** Дело всей жизни : [председатель профсоюзной первички ОАО «Днепро-Бугское» Марина Якимук награждена медалью «120 лет профсоюзному движению Беларуси»] / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. 2024. 14 снежня (№ 50). С. 7.
16. **Бакун, Е.** Скромна в общении, сильна в делах : [о бухгалтере ОАО «Днепро-Бугское» Кобринского района Елене Гапанович] / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. 2024. 12 кастрычніка (№ 41) . С. 12.
17. **Бакун, Е.** Мы вместе : [о работе председателя профсоюзного комитета ОАО «Днепро-Бугское» Марии Якимук] / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. 2023. 25 лістапада. С. 7.
18. **Пашкович, Л.** Быць адданым любімай справе : [дырэктар ААТ «Днепра-Бугскае» У. Л. Саўчук пайшоў на заслужаны адпачынак] / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. 2020. 4 красавіка (№ 26). С. 3.

19. **Пашкович, Л.** Сладкая работа : [о самой большой пасеке в районе, которая находится в ОАО «Днепро-Бугское»] / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. 2020. 6 чэрвеня (№ 43). С. 4.
20. **16 марта вступил в должность директора ОАО «Днепро-Бугское» Иван Демьянович Хомляк** // Кобрынскі веснік. 2020. 25 сакавіка (№ 23). С. 3.
21. **Пашковіч, Л.** Калі праца па душы : [пра галоўнага заатэхніка ААТ «Днепра-Бугскае» Т. Фядчышынай] / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. 2020. 4 студзеня (№ 1). С. 4.
22. **Пашкович, Л.** На поля выходил молодой агроном : [об агрономе ОАО «Днепро-Бугское» А. Концевиче] / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. 2019. 23 красавіка. С. 4.
23. **Пашкович, Л.** Пятнистые питомцы ОАО «Днепро-Бугское» / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. 2018. 11 ліпеня. С. 3.
24. **Юшкевич, П.** Пришлись олени ко двору : [в ОАО «Днепро-Бугское» еще с советских времен сохранилась оленеферма] / Павел Юшкевич // Сельская газета. 2017. 16 ноября. С. 15.
25. **Пашкович, Л.** Хозяйка фермы : [в ОАО «Днепро-Бугское» молочно-товарной фермой заведует Т. Федчишина] / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. 2016. 16 студзеня. С. 4.
26. **Казакова, А.** Любви народной достоин : [о первом руководителе совхоза «Днепро-Бугский» А. С. Ткачуке и открытии в его честь мемориальной доски] / Анна Казакова // Кобрин-информ. 2016. 14 января. С. 4.
27. **Пашковіч, Л.** Добрая праца не забываецца : [у пас. Арэхаўскі адкрыта мемарыяльная дошка першаму кіраўніку саўгаса «Днепра-Бугскі» А. С. Ткачуку] / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. 2016. 9 студзеня. С. 1.
28. **Пашкович, Л.** Дружный коллектив на комплексе : [о коллективе животноводческого комплекса ОАО «Днепро-Бугское»] / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. 2015. 6 мая. С. 6.
29. **Пантелеева, Е.** Панты оказались безпонтов : [об оленьей ферме ОАО «Днепро-Бугский» Кобринского района] / Екатерна Пантелеева // Рэспубліка. 2014. 12 снежня. С. 8.
30. **Пянко, А.** Работать и жить достойно : [ОАО «Днепро-Бугское»**]** / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. 2013. 9 сакавіка. С. 2.
31. **Пянко, А.** Есть прибавка и резервы для роста : [ОАО «Днепро-Бугское»] / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. 2012. 14 студзеня. С. 2.
32. **Веремеенко, С.** Сохранить оленеферму – задача дня сегодняшнего / Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. 2011. 17 февраля. С. 3.
33. **Сацук, А.** Абмалочваюць травы : [ААТ «Днепра-Бугскае» вырошчвае насенне траў] / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. 2010. 10 ліпеня. С. 1.
34. **Сацук, А.** Лепшы ветурач у ААТ «Днепра-Бугскае» : [Наталля Бура] / Аляксей Сацук // Кобрынскі веснік. 2009. 2 верасня. С. 3.

35. **Сацук, А.** Хозяин оленьего острова / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. 2009. 6 студзеня. С. 8.
36. **Панасюк, Н.** Создали хозяйства мехотряд : кормопроизводство / Николай Панасюк // Белорусская нива. 2008. 26 июля. С. 4.
37. **Сацук, А.** По поточно-цеховой системе : [в ОАО «Днепро-Бугское» действует поточно-цеховая система производства молока] / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. 2007. 22 верасня. С. 3.
38. **Знаёмцеся: саўгас «Днепра-Бугскі»** // Кобрынскі веснік. 1992. 11 лістапада. С. 3.
39. **Ткачук, А.** На ўрад спадзявайся, але і сам старайся : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Кобрынскі веснік. 1992. 11 лістапада.
40. **Саўгас «Днепра-Бугскі»**: радкі біяграфіі // Кобрынскі веснік. 1991. № 20. С. 1.
41. **Ткачук, А.** Ці ўсе рэзервы задзейнічаны? : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / Антон Ткачук // Камуністычная праца. Кобрын, 1990. 12 чэрвеня.
42. **Лебедзеў, Г.** Час Антона Ткачука : [пра дырэктара саўгаса «Днепра-Бугскі» А. С. Ткачука] / Г. Лебедзеў // Звязда. 1989. 3 студзеня.
43. **Дрымук, В.** Наш дэвіз – творчасць : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / В. Дрымук // Камуністычная праца. Кобрын, 1988. 4 студзеня.
44. **Ткачук, А.** По единому наряду : [об организации работы в совхозе «Днепро-Бугский»] / А. Ткачук // Заря. 1987. 30 июля.
45. **Ткачук, А.** Гарантируем большое молоко : [об опыте животноводов совхоза «Днепро-Бугский» Кобринского района] / А. Ткачук // Сельская газета. 1987. 15 июля.
46. **Ткачук, А.** Землю не обманешь : [совхоз «Днепро-Бугский»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. Кобрын, 1986. 28 января.
47. **Ткачук, А.** З дзяржаўных пазіцый : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. Кобрын, 1986. 3 красавіка.
48. **Ткачук, А.** Бачыць перспектыву : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. Кобрын, 1985. 23 сакавіка.
49. **Ткачук, А.** На подъеме : [рассказывает директор совхоза «Днепро-Бугский» Кобринского района] / А. Ткачук // Сельское хозяйство Белоруссии. 1985. № 1. С. 14–15.
50. **Писарев, Н.** Начало биографии : [пос. Днепро-Бугский Кобринского района] / Н. Писарев // Заря. 1984. 3 февраля.
51. **Ткачук, А.** Саўгас набірае сілу : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Звязда на меліярацыі Палесся. 1982. 16 снежня.
52. **Ткачук, А.** Дарогай станаўлення : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. Кобрын, 1982. 27 лістапада.
53. **Елец, П.** Растёт посёлок у Днепро-Буга : [Кобринский район] / П. Елец // Заря. 1982. 28 мая.